# ФОРМЫ АРГАНІЗАЦЫІ НАВУЧАННЯ БІЯЛОГІІ (частка І)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Кабелка Іван Уладзіміравіч, дацэнт кафедры спецыяльнай педагогікі**

# ПЛАН

1. Сістэма форм арганізацыі навучання.
2. Метадычныя асаблівасці ўрока біялогіі.
3. Падрыхтоўка настаўніка да ўрока.
4. Тыпалогія урокаў біялогіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Сістэма форм арганізацыі навучання

- Урокі і звязаныя з імі *абавязковыя* навучальныя экскурсіі, хатнія заданні.
- *Абавязковыя* пазаўрочныя працы (на прыродзе, у кутку жывой прыроды, на школьным вучэбна-доследным участку і інш.).
- *Неабавязковыя* пазавучэбныя экскурсіі і пазакласныя заняткі (індывідуальныя, групавыя, масавыя).
- Цесная ўзаемасувязь усіх форм з урокам — ***асноўнай*** арганізацыйнай формай навучання біялогіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Метадычныя асаблівасці ўрока

- Дакладнае размеркаванне часу на правядзенне ўсіх яго этапаў.
- Апора на пачуццёвы вопыт навучэнцаў і наяўныя ўяўленні.
- Праблемны падыход да выкладання новага навучальнага матэрыялу.
- Вар'іраванне спосабаў вывучэння новай вучэбнай інфармацыі (індуктыўны і дэдуктыўны).
- Вызначэнне вядучых і суправаджальных метадаў навучання. Насычанасць іх метадычнымі прыёмамі.
- Недапушчальнасць перагрузкі вывучаемым матэрыялам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Метадычныя асаблівасці ўрока

- Ажыццяўленне між- і ўнутрыпрадметных сувязей.
- Разнастайнасць відаў работ, прапанаваных для выканання.
- Карпатлівая тэрміналагічная праца.
- Спалучэнне франтальнай (групавой) работы з індывідуальным і дыферэнцыраваным падыходам.
- Усталяванне як блізкіх сувязяў (праверка хатняга задання), так і далёкіх (праверка раней пройдзенага).
- Краязнаўчая, экалагічная, карэкцыйна-развіваючая і прыкладная скіраванасць урока.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Падрыхтоўка настаўніка да ўрока

- Высвятленне месца ўрока ў сістэме ўрокаў курсу і раздзелу.
- Вывучэнне метадычнай літаратуры па тэме ўрока. Пільны адбор вучэбнай інфармацыі, якая выкладаецца.
- Выбар метадаў і метадычных прыёмаў, вызначэнне аптымальных варыянтаў іх спалучэння і суадносіны.
- Падрыхтоўка наглядных дапаможнікаў, раздатачнага і дыдактычнага матэрыялу.
- Вызначэнне тыпу ўрока (па дыдактычным задачам і фарміруемым паняццям), яго структурных кампанентаў, задач (адукацыйнай, карэкцыйна-развіваючай і выхаваўчай).
- Складанне плана ўрока і напісанне яго разгорнутага канспекта (для настаўніка-пачаткоўца).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Тыпалогія ўрокаў

- Тыпы ўрокаў па ***дыдактычным задачам:*** *камбінаваныя (змешаныя) і спецыялізаваныя:* вывучэння новага навучальнага матэрыялу, абагульнення і сістэматызацыі ведаў, замацавання ведаў і ўменняў, праверкі і ацэнкі фарміруемых ведаў і ўменняў.
- Рэалізацыя на *спецыялізаваных* ўроках толькі *адной* з дыдактычных задач: вывучэнне новага навучальнага матэрыялу, замацаванне фарміруемых ведаў і ўменняў, іх праверка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Тыпалогія ўрокаў

- Разнавіднасці ўрокаў па ***фарміруемым паняццям***: марфалагічныя, анатамічныя, фізіялагічныя, сістэматычныя, экалагічныя, прыкладныя (агра- і заатэхнічныя, санітарна-гігіенічныя і медыцынскія).
- Віды ўрокаў па ***становішчы*** ў тэме: уступныя, бягучыя (раскрываюць змест тэмы) і заключныя або абагульняючыя.
- Самы распаўсюджаны тып урока – *камбінаваны.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Літаратура


- Кабелка, И.В. Обучение биологии учащихся вспомогательной школы: учеб-метод. пособие / И.В. Кабелка. – Минск : БГПУ, 2013. – 180 с.
- Кручинина, С.С. Методика преподавания естествознания во вспомогательной школе: учеб.-метод. пособие. / С.С. Кручинина, И.В. Кабелка. – Мн : БГПУ, 2002. – 102 с.
- Пономарева, И.Н. Общая методика обучения биологии: учеб. пособие для студ. пед. вузов / И.Н. Пономарева, В.П. Соломин, Г.Д. Сидельникова. – М. : Издательский центр «Академия», 2003. – 272 с.
- Серединская, О.Х. Обучение биологии в 7-10 классах 1-го отделения вспомогательной школы / О.Х. Серединская. – Мн.: Адукацыя і выхаванне, 2009. – 182 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ